

*В. І.* ***Ялатаў.***

«Канец сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1977).

*Тв.:* Зб. твораў Т. 1—3. Мн., 1978—80.

*Літ.:* Б а р с т о к М.М. Алесь Якімовіч // Беларуская дзіцячая літаратура. 2 выд. Мн., 1980.

*М. Б. Яфімава.*

**ЯЛА́ТАЎ** Віктар Іванавіч (10.8.1923, Баку — 1.9.1980), музыказнавец-фалькларыст. Доктар мастацтвазнаўства (1978). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1986. Скончыў Азербайджанскую кансерваторыю (1955). З 1955 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Даследаваў лад, рытм, мелодыку бел. нар. музыкі. Аўтар кніг «Ад песні да песні» (1961), «Ладавыя асновы беларускай народнай музыкі» (1964), «Рытмічныя асновы беларускай народнай музыкі» (1966), «Меладычныя асновы беларускай народнай музыкі» (1970), «Па слядах аднаго рытму» (1974), «Песні ўсходнеславянскай супольнасці» (1977). Складальнік музычнай часткі тамоў з серыі БНТ: «Песні савецкага часу» (1970), «Радзінная паэзія» (1971), «Дзіцячы фальклор» (1972), «Жніўныя песні» (1974), «Веснавыя песні» (1979), «Валачобныя песні» (1980), «Восеньскія і талочныя песні» (1981).

*Літ.:* М а ж э й к а З. Першапраходзец беларускай акадэмічнай музыкалогіі // Мастацтва. 2004. № 1.

*З. Я. Мажэйка.*

**ЯЛЕ́НСКАЯ** (Д м а х о ў с к а я) Эма (29.2.1864, в. Камаровічы Петрыкаўскага р-на — 24.1.1919), фалькларыстка і этнограф, польская пісьменніца. Пад уплывам *Я.Карловіча* зацікавілася побытам і духоўнай культурай бел. народа. Запісала 11 сшыткаў нар. песень (не знойдзены). Склала 2 рукапісныя зборнікі: «Беларускія казкі з Мазырскага, Рэчыцкага і Навагрудскага паветаў» (62 творы, выдадзеныя ў 1976 пад назвай «Беларускі казачны эпас) і «Беларускія песні і загадкі з Мазырскага, Рэчыцкага і Пінскага паветаў» (360 песень, якія класіфікавала як «простыя», жартаўлівыя, калыханкі, калядкі, святыя, велікодныя, вяснянкі, купальныя, жніўныя, талочныя, вясельныя; 103 загадкі і 2 галаваломкі; абодва захоўваюцца ў архіве Польскай АН у Кракаве). У сваёй асноўнай этнаграфічнай працы «Вёска Камаровічы ў Мазырскім павеце» (1891) дала грунтоўнае апісанне жыццёвага ўкладу, працоўнай дзейнасці і эстэтычных поглядаў палескіх сялян: расказала пра сямейныя абрады (Хрэсьбіны, Вяселле, Памінкі), каляндарныя святы і прысвяткі (Каляды, Вялікдзень, Русалле, Купалле, Пятроўка, Андрэй), ахарактарызавала розныя песенныя цыклы, прывяла прыклады нар. твораў разнастайных відаў і жанраў (забаўлянкі, гульні, мянушкі, праклёны, прыкметы, забабоны, чарадзейства), раскрыла багаты свет міфалагічных вераванняў палешукоў (Дамавік, Лясны дзед, злыдні, русалкі і інш.). У 1894—95 часопіс «La Tradition» («Традыцыя») апублікаваў яе даследаванне «Палескі фальклор» і ў перакладзе на французскую мову 8 бел. нар. песень (казацкая, салдацкая, веснавая, любоўныя, балады). Даслала ў часопіс «Wisła» («Вісла») 5 калыханак (адна з нотамі), 5 сродкаў нар. лячэння ад розных хвароб людзей і свойскай жывёлы, легенды. У зборніку да 100-годдзя з дня нараджэння А.Міцкевіча (1898) змясціла легенды пра возера Свіцязь. Пры запісванні нар. твораў дакладна перадавала асаблівасці мясцовых гаворак. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літвы зберагаюцца яе запісы легенд, 45 прыказак.

*Літ.:* В а с і л е в і ч У. А. «Паненка» з вёскі Камаровічы // Работніца і сялянка. 1986. № 2; Я г о ж. Збіральнікі. Мн., 1991. С. 88—108.

*У. А. Васілевіч.*

**ЯЛІ́ЗАЎСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ АНСА́МБЛЬ «ВЕЧАРЫ́НКА»** г а р п а с я л к о в а г а Д о м а к у л ь т у р ы А с і п о в і ц к а г а р а ё н а. Заснаваны ў 1974 як фалькл. ансамбль «Вячоркі», з 1996 народны і сучасная назва. Кіраўнікі: М.Баразна (з 1974), Д.Рабава (з 1979). У рэпертуары бел. нар. песні ў апрацоўках А.Наско («Прыдарожныя бярозы», «Родны край»), М.Корсака («Ой, у лузе, лузе», «У садзе гуляла»), А.Рашчынскага («Па гарохаўю, па ячаню», «Як на рэчачцы, на дошчачцы»), М.Сіраты («Як паедзем мы ў госці», «Пара мужу дадому», «Шумяць вербы», «Вярба»), сюжэтныя карцінкі, сцэнічныя замалёўкі і інш. Паставіў музычныя праграмы «Запрашаем на вячоркі», «Кірмаш на сучасны лад», «У гасцях у бабы Лены», «Каляды», «Уваходзіны» і інш. Калектыў — дыпламант Усесаюзнага фестывалю нар. мастацтва (1987), рэспубліканскіх фестываль нар. мастацтва «Беларусь — мая

песня» (1998), свята «Дажынкі» (г. Шклоў, 2000), Дзён славянскага пісьменства і друку (г. Мсціслаў, 2001), фестывалю «Дняпроўскія галасы» (г. Дуброўна, 2003). У тэлеперадачы «Запрашаем на вячоркі» паказваў абрад Уваходзіны.

*С.С. Авадок.*

**ЯНІ́ШЧЫЦ** Яўгенія Іосіфаўна (20.11.1948, в. Рудка Пінскага р-на — 25.11.1988), паэтэса. Скончыла БДУ (1971). Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Янкі Купалы 1986, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1978. У зборніку «Снежныя грамніцы» (1970) арыенталася на здабыткі вуснай нар. творчасці: сялянскія песні, каляндарныя святы і абрады («Сялянскае застолле» і інш.). Як і нар. песні, вершы зборніка заснаваны на паўторах, якія ствараюць напеўную рытмамелодыку («Ты пакліч мяне, пазаві...», «Прыедзь у край мой ціхі...» і інш.). У кнізе «Ясельда» (1978) выкарыстоўвала традыцыйныя фалькл. вобразы аблачынкі (хмаркі), жыта і бярозы («Вунь першая хмара павісла бянтэжна...», «Не воблака, а проста аблачынка...», «Ірвёмся ў неабжытае...», «Бунтуе рошчына ў дзяжы...», «Я дыханнем цябе абаўю...»), узгадвала нар. прымаўкі («Бацькава дарога»), прыпеўкі («Спыню свой крок адчайны і таропкі....»), песні. Стылізавала вершы пад фалькл. творы («Сянцо каля гумна...», «Балада вернасці», «Маналог вавёркі», «Маналог яблыні», «Апавяданне пра жытнёвы сноп»). У зборніку «Пара любові і жалю» (1983) звярнулася да сталых нар. вобразаў (поўдзень спелы, горкая адплата, ліхая скруха, шэрая зязюля, ясны промень і інш.), нар. лексікі («У Белавежы», «Вясло і перавясла»), прымавак («Бацькавы дровы»), паўтораў і прыдаткаў («Дзе ты прапала», «Добры вечар, землякі!»), традыцыйных фалькл. вобразаў жорава і сініцы («Жораў ты, а я — сініца...»), ластаўкі і рабіны («Як за дажджамі частымі-рабымі...»). У вершы «То цёмны бор, то рэдзенькі лясочак...» выказвае веру і спадзяванне ў адраджэнне і ўваскрашэнне пры дапамозе ачышчальнай сілы агню, што характэрна для фалькл. казак і паданняў. Апошняя кніга паэзіі Я. «Каліна зімы» (1987) — сведчанне шырокага выкарыстання набыткаў бел. мовы і фальклору (вершы «Тут», «Пра назвы», «Балада калодзежа», «Балада вяртання», «Прытча пра бочку», «Ой, пры каліне чырванашчо-кай, ды пры даліне зялёнай — сяло»). Паэтыка яе твораў заснавана на арганічным спалучэнні і ўзаемасувязі разнастайных мастацкіх прыёмаў і сродкаў вуснай нар. творчасці і індывідуальна-аўтарскага адлюстравання быцця.



*Ялізаўскі народны фальклорны ансамбль «Вечарынка».*

*Тв.:* Дзень вечаровы. Мн., 1974; У шуме жытняга святла. Мн., 1988.

*Літ.:* Б у г а ё ў Дз. Усхваляванае слова паэтэсы // Бугаёў Дз. Талент і праца. Мн., 1979; Я г о ж. Плённы працяг // Бугаёў Дз. Чалавечнасць. Мн., 1985; Г н і л а м ё д а ў У. Разгадваючы тайну быцця: (Яўгенія Янішчыц) // Гніламёдаў У. Ля аднаго вогнішча. Мн., 1984; Я г о ж. Сучасная беларуская паэзія: Творч. індывідуальнасць і літ. працэс. Мн., 1983. С. 234—238, 249—250; С е м а ш к е в і ч Р. Выпрабаванне любоўю // Семашкевіч Р. Выпрабаванне любоўю. Мн., 1982; Ч а б а н Т. Крылы рамантыкі. Мн., 1982. С. 102—103.

*І. М. Гоўзіч.*

**ЯНКАВІ́ЦКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ АНСА́МБЛЬ «КРЫНІ́ЦА»** с е л ь с к а г а Д о м а к у л ь т у р ы Ра-



*Янкавіцкі народны фальклорны ансамбль «Крыніца».*